**В. М. Бігеза,**
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт,*
*дацэнт кафедры бібліятэчна-*
*інфармацыйнай дзейнасці*

# АДМЕТНАСЦІ ІНАВАЦЫЙНАЙ ПРАФЕСІЙНАЙ ПАДРЫХТОЎКІ БІБЛІЯТЭЧНЫХ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У сучасных умовах усталяваная традыцыйная тэхналогія, арыентаваная ў асноўным на засваенне навучэнцамі гатовых ведаў, на думку шматлікіх навукоўцаў з'яўляецца недастатковай. Гэта абумоўлена хуткімі зменлівымі працэсамі, якія адбываюцца ў грамадстве, што патрабуе ўдасканалення тэхналогій адукацыі ў напрамку развіцця актыўнасці і самастойнасці студэнтаў, развіцця пазнавальных творчых здольнасцей будучага спецыяліста-прафесіянала.

Інавацыя ў адукацыі – гэта новая ідэя, новы метад ці новы праект, якія наўмысна ўводзяцца ў сістэму традыцыйнай адукацыі [1, с. 15]. Гэта аснова развіцця сістэмы адукацыі, навучальнай установы, кожнага ўдзельніка педагагічнага ўзаемадзеяння.

Адукацыя як галіна сацыяльнай дзейнасці павінна апярэджваць у сваім развіцці іншыя формы актыўнасці людзей, асабліва іх вытворчую дзейнасць. Інавацыйная прафесійная адукацыя накіравана на развіццё ў чалавека прыроднай схільнасці да атрымання ведаў і пераходу ад канцэптуальнага асэнсавання рэчаіснасці да вырашэння прыкладных сацыяльных, кіраўнічых, арганізацыйных, тэхналагічных задач.

Падкрэслім, што інавацыйнае навучанне ў сістэме вышэйшай адукацыі разглядаецца навукоўцамі шматгранна [2].

Калі практыкі часцей заклапочаны канкрэтнымі вынікамі аднаўленняў, вучоных у сваю чаргу цікавіць сістэма ведаў і адпаведных ім відаў дзейнасці, якія вывучаюць, тлумачаць, абгрунтоўваюць педагагічную інаватыку, яе ўласныя прынцыпы, заканамернасці, паняційны апарат, сродкі, межы прымянення і іншыя навуковыя атрыбуты, характэрныя для тэарэтычных вучэнняў усе метадалагічныя аспекты вывучэння і канструявання педагагічных новаўвядзенняў.

Сення гэтую праблематыку актыўна вывучаюць такія даследчыкі, як Н. Р. Юсуфбекава, А. В. Хутарской, В. А. Сласценін, Л. С. Падымава, С. Д. Палякоў, М. М. Паташнік і інш. Сярод беларускіх даследчыкаў вылучаюцца выкладчыкі і даследчыкі БДПУ імя М. Танка, БДУ, РІВШ БДУ – І. І. Цыркун, П. Д. Кухарчык, А. І. Андарало, В. Л. Жук, А. В. Макараў, А. В. Торхава, Е. Г. Палупанава і інш.

Педагагічная інаватыка і яе метадалагічны апарат з'яўляюцца дзейсным сродкам аналізу, абгрунтавання і праектавання, мадэрнізацыі адукацыі.

Неабходна падкрэсліць, што нягледзячы на адсутнасць комплекснай праграмы і спланаваных мерапрыемстваў па развіцці інавацыйнай бібліятэчнай адукацыі, гэта праблема не здымаецца ні ў тэарэтычным, ні ў практычным аспектах. Вынікі асэнсавання гэтых пытанняў, раскрыццё вопыту работы ў гэтым кірунку мы знаходзім у матэрыялах навуковых, навукова-метадычных канферэнцый, навуковых артыкулах выкладчыкаў факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый БДУКМ – В. М. Бігезы, С. В. Зыгмантовіч, С. А. Паўлавай, В. І. Саітавай, М. А. Яцэвіча і інш.

Як бачым, пытанні, звязаныя з інавацыйнай адукацыяй, у тым ліку і бібліятэчнай, актыўна абмяркоўваюцца як у нашай краіне, так і за мяжой. Неабходнасць удасканалення падрыхтоўкі бібліятэчных спецыялістаў звязваюць з тэхналагічным і сацыяльным развіццем грамадства, інфармацыйна-тэхналагічнай перабудовай бібліятэчнай вытворчасці, працэсамі глабалізацыі эканомікі, інфармацыйна-тэхналагічных камунікацый і інтэрнацыяналізацыяй адукацыі.

Сістэма інавацыйнай бібліятэчнай адукацыі – гэта мэтанакіраванае фарміраванне пэўных ведаў, уменняў і метадалагічнай культуры, а таксама комплексная падрыхтоўка і выхаванне спецыялістаў у галіне бібліятэчнай справы да інавацыйнай бібліятэчна-бібліяграфічнай дзейнасці за кошт адпаведнага зместу, метадаў навучання і навукаваёмкіх адукацыйных тэхналогій. Менавіта гэта сістэма стымулюе імкненне ў будучых спецыялістаў унесці змены ў існуючую культуру, сацыяльную сферу і г. д. з мэтай стварэння новага, канкурэнтаздольнага прадукту, давядзенне яго да спажыўца. Такі тып бібліятэчнай адукацыі фарміруе арыентацыю студэнтаў на

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

праблемныя сітуацыі, на самастойны пошук шляхоў іх вырашэння. Безумоўна, гэта патрабуе ад выкладчыка высокага прафесійнага узроўню, творчага падыходу да правядзення лекцыйных, семінарскіх, практычных заняткаў, стымулявання актыўнай самастойнай работы студэнтаў з улікам індывідуальных асаблівасцей кожнага студэнта.

Выкладчыкі сення не столькі павінны перадаваць асабістыя веды студэнтам, колькі умець сфарміраваць матывацыю на фарміраванне ведаў, стварыць умовы для самавызначэння ў працэсе навучання, у якіх студэнты могуць эфектыўна атрымліваць новую інфармацыю, фарміраваць новыя ідэі, выкарыстоўваючы пэўны запас ведаў і вопыт, імкнуцца вырашаць існуючыя праблемы.

Інавацыйная адукацыйная дзейнасць па прафесійнай падрыхтоўцы бібліятэчных спецыялістаў вышэйшай адукацыі знаходзіць свае адлюстраванне як у змесце, так і ў формах навучання. Наша ўвага да рознага роду інавацый абумоўлена, перш за ўсе, патрэбнасцю выклікаць устойлівы інтарэс студэнтаў да абранай спецыяльнасці, да вывучаемых прадметаў, набліжэннем адукацыі да практычнай дзейнасці.

У працэсе выкладання спецыяльных дысцыплін мы выкарыстоўваем дзейнасна-арыентаваныя тэхналогіі: кантэкстнае навучанне, арганізацыйна-дзейнасныя гульні, дыдактычныя заданні, імітацыйна-гульнявое мадэліраванне бібліятэчна-бібліяграфічных працэсаў і інш. Так, напрыклад, у курсе «Інавацыйны бібліятэчны менеджмент» выкарыстоўваецца методыка чытання лекцый з працэдурай пауз, якая дазваляе студэнту задаць пытанні выкладчыку па тэме. Пры правядзенні семінарскіх заняткаў студэнтам прапаноўваецца прадстаўленне дакладу ў форме дыялогу з групай, дзе прысутнічае элемент спаборніцтва. Рэфератыўнае паведамленне можа быць падрыхтавана з выкарыстаннем прэзентацыі. У канцы семінарскіх заняткаў з мэтай сістэматызацыі ведаў па тэме, акцэнтавання ўвагі на ключавых пытаннях праводзіцца бліц-апытанне. У адпаведнасці з тэмай заняткаў уключаем пытанні, якія адлюстроўваюць міждысцыплінарныя сувязі. На практычных занятках студэнтам прапаноўваюцца сітуацыі, дзелавыя гульні, вырашэнне якіх дапамагае сістэматызаваць і практычна прымяніць атрыманыя ў ходзе лекцыйных заняткаў і самастойнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

работы веды. Так, напрыклад, у курсе «Бібліятэчна-інфармацыйны маркетынг» выкарыстоўваюцца педагагічныя методыкі і тэхналогіі, якія садзейнічаюць творчай актыўнасці студэнтаў, набыццю вопыту самастойнага вырашэння разнастайных вытворчых задач. Для падрыхтоўкі студэнтаў у галіне маркетынгу бібліятэчнай справы, тэхналогіі інтэрактыўнага навучання ўяўляюць асаблівую цікавасць, таму што дазваляюць у працэсе навучання (практычныя заняткі) вырашаць вытворчыя задачы, накіраваныя на перспектыўнае развіццё бібліятэк. Напрыклад, распрацоўваць і праводзіць маркетынгавыя даследаванні, неабходныя для вырашэння праблемных сітуацый у бібліятэцы, авалодаць метадамі планавання маркетынгавай дзейнасці, здзяйсняць маркетынгавую ацэнку дзейнасці бібліятэкі, устанаўліваць кошт на бібліятэчна-інфармацыйны прадукт/паслугу, ствараць бізнес-план бібліятэкі, рэкламную прадукцыю і інш. Усё гэта, безумоўна, дапаможа студэнтам у будучай прафесійнай дзейнасці прымаць эфектыўныя нестандартныя рашэнні, аператыўна адаптавацца да зменлівай сітуацыі, бачыць і ацэньваць перспектывы развіцця бібліятэчнай справы і рэальныя магчымасці канкрэтнай бібліятэкі. Па названаму курсу для студэнтаў праводзіцца інтэрактыўная лекцыя «Інтэрв'ю думак». Яе мэта – арганізацыя працэсу вывучэння тэарэтычнага зместу ў інтэрактыўным рэжыме. Пытанні да інтэрв'юіравання фармулiруюцца загадзя па тэме лекцыі на аснове вывучэння крыніц. Суб'ектам інтэрв'ю звычайна выступаюць студэнты, якія падрыхтавалі інфармацыю, пытанні па дадзенай тэме. Пытанні задаюцца з месца студэнтамі між сабой па чарзе з пачатку лекцыі. Адны з іх выступаюць інтэрв'юерамі, іншыя – рэспандэнтамі. Агульная падрыхтоўка студэнтаў да такой лекцыі вымагае іх уважлівага вывучэння тэмы лекцыі, бо распрацоўка пытанняў патрабуе ведання матэрыялу. Выкладчык падводзіць канчатковыя вынікі па вывучэнні і засваенні лекцыі студэнтамі. Пры гэтым заслухоўваюцца меркаванні студэнтаў-экспертаў з аўдыторыі па зместу атрыманай інфармацыі, аб'ем разгледжанага матэрыялу, якасць заданых пытанняў.

Пры выкладанні курса «Бібліятэчна-інфармацыйны маркетынг» праводзяцца семінары-дыскусіі. Заданні, якія прапануюцца студэнтам, носяць праблемны, дыскусійны характар,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

што прадугледжвае актыўны іх удзел у абмеркаванні, агучванне асабістых думак па разглядаемай праблеме. Напрыклад, у тэме семінара «Сутнасць айчынных і замежных методык ацэнкі эфектыўнасці маркетынгу, іх выкарыстання ў сферы бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці» студэнты вывучаюць айчынны і замежны вопыт тэарэтычнага і практычнага асэнсавання праблем, выкарыстоўваючы разнастайныя традыцыйныя і электронныя рэсурсы. Так, пры разглядзе сутнасці айчынных, замежных методык ацэнкі эфектыўнасці маркетынгу, студэнтам неабходна правесці самастойны аналіз існуючых разнастайных метадаў, распрацаваных «Міжнародным кіраўніцтвам па вымярэнню эфектыўнасці работы бібліятэк і комплексным падыходам да яе вымярэння».

На семінары-дыскусіі найбольш адэкватна рэалізуецца прынцып круглага стала. На абмеркаванне выносяцца актуальныя пытанні вывучаемай дысцыпліны і кожны студэнт мае магчымасць выказаць сваю думку.

Кожны з удзельнікаў дыскусіі павінен вучыцца дакладна фармуляваць свае думкі ў выступленні, актыўна адстойваць свой пункт гледжання, аргументавана весці спрэчкі. Глыбокае засваенне ведаў на семінары дасягаецца за кошт таго, што студэнт набывае іх асабістай працай.

Гульнявыя формы пры выкладанні названага курса выкарыстоўваюцца на практычных занятках пры вывучэнні методыкі выяўлення вобраза бібліятэкі. Студэнты падзяляюцца на дзве падгрупы (супрацоўнікі бібліятэкі і карыстальнікі) і, выкарыстоўваючы метад семантычнага дыферэнцыяла, вызначаюць эмацыянальныя адносіны да пэўнай бібліятэкі вышэй адзначанных груп. Пры гэтым неабходна выявіць адрозненні ў меркаваннях, а таксама дакладныя прычыны разыходжання ва ўспрыманні бібліятэкі карыстальнікамі і бібліятэкарамі. Абгрунтаваць самыя высокія адзнакі і самыя нізкія, даць ім тлумачэнне. Распрацаваць прапановы па паляпшэнні сітуацыі.

Абагульняючы сказанае, падкрэслім, што інавацыйная прафесійная падрыхтоўка бібліятэчных спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі нам бачыцца ў неабходнасці асэнсавання кожным выкладчыкам значнасці інавацыйнага падыходу ва ўсіх відах дзейнасці, стварэнні ўмоў і распрацоўкі сістэмы матывацыі развіцця інавацыйных працэсаў на розных узроўнях – ВНУ,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

факультэта, кафедры, асобнага выкладчыка. Паслядоўнае прымяненне інавацыйных адукацыйных тэхналогій дазволіць сфарміраваць спецыяліста, які будзе творча мысліць, валодаць камунікатыўнымі навыкамі і імкнуцца да самаразвіцця і самаўдасканалення.


1. *Макаров, А. В.* Инновационные образовательные системы в высшей школе: проблемы качественного развития / А. В. Макаров // Выш. шк. – 2018. – № 2. – С. 15–18.

2. *Макаров, А. В.* Болонский процесс: Европейское пространство высшего образования / А. В. Макаров. – Минск : РИВШ, 2015. – 260 с.

3. *Макаров, А. В.* Инновационные образовательные системы в высшей школе: проблемы качественного развития / А. В. Макаров // Выш. шк. – 2018. – № 2. – С. 15–18.

4. *Макаров, А. В.* Диагностирование компетенций студентов: аналитический обзор / А. В. Макаров // Выш. шк. – 2019. – № 2. – С. 18–22.

5. *Ялалов, Ф. Г.* Деятельностно-компетентностный подход к практико-ориентированному образованию [Электронный ресурс] // Интернет-журнал «Эйдос». – 2007. – 15 янв. – Режим доступа: http://www.eidos.ru/journal/2007/0115–2.htm. – Дата доступа: 15.12.2020.

6. *Хуторской, А. В.* Педагогическая инноватика: методология, теория, практика / А. В. Хуторской. – М. : УНЦ ДО, 2005. – 161 с.



**Т. П. Бируля,** *старший преподаватель кафедры белорусской и зарубежной филологии*


# ПРИМЕНЕНИЕ ИНФОРМАЦИОННО-КОММУНИКАТИВНЫХ ТЕХНОЛОГИЙ В ПРОЦЕССЕ ЯЗЫКОВОЙ ПОДГОТОВКИ СОВРЕМЕННОГО СПЕЦИАЛИСТА

Современный этап развития общества характеризуется процессами интеграции в сфере науки, образования и культуры, а также возросшей значимостью интеллектуального труда, ориентированного на использование информационных ресурсов. Способность осуществлять доступную и оперативную коммуникацию для работы над едиными проектами и решения совместных научно-исследовательских задач является одной из самых важных профессиональных компетенций. Данные условия требуют существенных изменений в системе языковой

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ